ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 201 (1168) | НЯДЗЕЛЯ, 31-га жніўня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

ПАВЯЛІЧЫЦЬ ЭНЭРГІЮ, НАПРУЖЫЦЬ СІЛЫ

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанавіў увесьці з 1930-31 году ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучаньне дзяцей ва ўзросьце 8-9-10 год, з пасьлядоўным распаўсюджваньнем абавязковага пачатковага навучаньня на дзяцей 11 год у 1931-1932 г.

Увесьці з 1930-31 году абавязковае навучаньне пераросткаў (ад 11 да 15 год), якія не прашлі курсу пачатковай школы, на грунце паскораных форм навучаньня двухгадовых і аднагадовых курсаў.

Прыступіць з 1930-31 году да ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня ў аб'ёме школы-сямігодкі ў прамысловых гарадох, у фабрычна-заводзкіх раёнах і рабочых пасёлках, устанавіўшы абавязковае навучаньне ў школе-сямігодцы для канчаючых у гэтым годзе пачатковую школу першай ступені".

Гэтае рашэньне ЦК мае надзвычайна вялікае палітычнае значэньне. Увядзеньнем усеагульнага навучаньня будзе нанесен руйнуючы ўдар па некультурнасьці, цемры і непісьменнасьці.

Гэтае рашэньне мае асабліва вялікае значэньне для комсамолу, бо яно адыгрывае вялізарнейшую ролю ў справе комуністычнага выхаваньня маладых кадраў.

Ажыцьцяўленьне гэтай сапраўды рэволюцыйнай задачы магчыма толькі пры найбольшай мобілізацыі сіл усяе грамадзкасьці—гаспадарчых, профсаюзных, коопэрацыйных і, у першую чаргу,—памочніка партыі—комсамольскіх організацый.

На фронце правядзеньня ўсеагульнага навучаньня менавіта тут, дзе справа ідзе аб „самых кроўных інтарэсах надрастаючага пакаленьня", комсамол абавязан быць у першых шэрагах.

Ленін казаў:

„Комунізм месьціцца ў тым, каб уся моладзь, тыя юнакі і дзяўчаты якія састаяць у саюзе моладзі, сказалі,—гэта наша справа, мы аб'яднаемся і пойдзем на вёску, каб ліквідаваць непісьменнасьць, каб наша падрастаючае пакаленьне ня мела непісьменных".

Добра памятаючы гэтыя запаветы Ільліча, Цэнтральны Камітэт КСМ пастанавіў прыняць шэфства комсамолу над правядзеньнем усеагульнага абавязковага навучаньня.

Узяцьце шэфства ўскладае на комсамол вялікія абавязкі ў сэнсе ўзмацненьня яго ўдзелу на фронце культурнай рэволюцыі.

„Комсамол павінен забясьпечыць організацыю комуністычнага выхаваньня тых новых мільёнаў дзяцей, якія ідуць у гэтым годзе ў школу.

На падставе гэтага ЦК УсеЛКСМ даў шэраг практычных паказаньняў, выкананьне якіх павінна быць скіравана на найлепшае правядзеньне ўсеагульнага навучаньня.

Як-жа выканала комсамольская організацыя Беларусі гэтыя абавязкі?

Патрэбна з усёй рашучасьцю заявіць, што гэтыя абавязкі ў вялікай меры ня выкананы.

Комсамольскія організацыі Беларусі не праявілі яшчэ ў гэтым пытаньні патрэбнай „энэргіі і настойлівасьці".

Пагроза зрыву навучальнага году не толькі не ліквідавана, а наадварот—паўстала з яшчэ большай рэальнасьцю.

Матар'ялы, якія зьмяшчаюцца сёньня на 3-яй старонцы і зьмяшчаліся днямі на старонках нашай газэты, падаюць трывожныя сыгналы.

Мы стаім перад фактамі безадказных адносін да падрыхтоўкі навучальнага году не толькі з боку гаспадарчых і профэсыйных, але і органаў Нарасьветы, якія здавалася-б павінны былі праявіць найбольшую руплівасьць у гэтай справе.

Яшчэ да гэтага часу няма праграм для ўсіх масавых школ. А калі і ёсьць, дык далёка не ў здавальняючай колькасьці.

З будаўніцтвам новых і рамонтам старых памяшканьняў пад школы справа таксама абстаіць з рук вон дрэнна.

У № 198 „Чырвоная Зьмена" пісала, што адусюль паступаюць весткі аб зрыве будаўніцтва і рамонту школ. Што Нарасьветы ў гэтым напрамку пакуль што „можа пахваліцца толькі... прарывамі".

Матар'ял, які мы сёньня зьмяшчаем, дае нам права заявіць, што гэтая справа стаіць на мёртвым пункце.

Пытаньне аб забясьпечаньні дзяцей беднаты вопраткай і продуктамі ўсё яшчэ вырашаецца дзесьці ў габінэтах.

Нераспарадчасьць НКА прывяла да таго, што ў справе разьмеркаваньня настаўнікаў атрымалася цэлая неразьбярыха,—у адны раёны настаўнікаў паслана больш чым трэба, а ў другіх адчуваецца вялікі недахоп.

Патрэбна з асаблівай рэзкасьцю падкрэсьліць, што комсамольскія організацыі Беларусі ня выканалі абавязкаў аб мобілізацыі комсамольцаў у пэдагогічныя ўстановы. З патрэбных 1440 чалавек пакуль што мобілізавана ўсяго...5-10.

Гэтая лічба кладзецца ганебнай плямай на комсамольскія організацыі Беларусі.

Такім чынам усе даныя гавораць аб трывожным становішчы на фронце падрыхтоўкі да навучальн. году.

Не марудзячы ні дня комсамольскія організацыі з падзесяцёрнай энэргіяй і настойлівасьцю, закасаўшы рукавы, павінны з поўным напружаньнем усваіх сіл узяцца за ліквідацыю гэтага ганебнейшага прарыву.

Патрэбна і на гэтым фронце даказаць, што комсамол зьяўляецца „ударнай групай, якая ва ўсякай рабоце аказвае сваю дапамогу, праяўляе сваю ініцыятыву, свой пачын" (Ленін).

ЦК УсеЛКСМ прапанаваў усім організацыям організаваць Усесаюзны налёт „Лёгкай Кавалерыі" на ўстановы, якія маюць дачыненьні да навучальнага году.

Гэтую дырэктыву патрэбна неадкладна ажыцьцявіць.

Напорам „кавалерыйскіх пік" зламаць бюрократычныя і опортуністычныя рагаткі, якія ставяцца Нарасьветаўскімі і іншымі організацыямі на шляху правядзеньня ўсеагульнага навучаньня.

Часу да пачатку навучальнага году засталося мала.

Кожная хвіліна дорага.

Толькі круты пералом у рабоце ўсіх організацый комсамолу Беларусі дасьць магчымасьць наверстаць упушчанае.

Толькі ўпартай работай мы зможам выканаць узятыя абавязацельствы па шэфству. „Дабіцца максымальнага прыцягненьня сродкаў гаспадарчых органаў, коопэрацыі, профсаюзаў, грамадзкіх організацый і працоўных, організаваць сіламі комсамольцаў і моладзі з шырокім прыцягненьнем дарослых „суботнікі", тыдні рамонту школы, школьнага інвэнтару, загатоўкі апалу і г. д. Комсамольскія організацыі павінны праявіць больш энэргіі і і настойлівасьці ў барацьбе за забясьпечаньне школ абсталяваньнем і вучэбна-дапаможным матар'ялам. Неабходна забясьпечыць будаўніцтва новых школ праз адпаведныя органы будаўнічымі матар'яламі".

Ганебнейшую пляму, нявыкананьне разьвёрсткі па мобілізацыі комсамольцаў у пэдагогічныя тэхнікумы і ВНУ, мы абавязаны ў самы кароткі тэрмін з сябе зьняць. Райкомы комсамолу павінны незабываць, што цэнтр цяжару зараз ляжыць на іх.

Пачатак гэтага навучальнага году павінен стаць пераломным пэрыодам у справе правядзеньня рашучага курсу на ажыцьцяўленьне задач політэхнізацыі школ.

Комсамольскія камітэты, ячэйкі, піонэр-атрады павінны змагацца за хутчэйшую рэорганізацыю сямігодак у ФЗС у горадзе і ШСМ—у вёсцы, прыняць непасрэдны ўдзел у прымацаваньні ФЗС і ШСМ да заводаў, фабрык і колгасаў, адшукаць неабходнае абсталяваньне для організацыі майстэрань пры школах.

Толькі пры той умове, калі кожны комсамольскі камітэт, кожная ячэйка, кожны піонэр-атрад выступяць „застрэльшчыкамі грамадзкай ініцыятывы і самадзейнасьці, організуюць культпаходы, соц. спаборніцтва, ударны рух, шэфства прад-

V кongрэс Профінтэрну

Умовы працы і быту рабочых СССР—пакуль што толькі мары зарубежных рабочых

Спрэчкі па дакладу тав. Швэрніка

На конгрэсе Профінтэрну заканчваюцца спрэчкі па дакладу тав. Швэрніка.

Рабочы-хэмік тав. Райт (Ангельшчына) канстатуе, што сацыялістычнае будаўніцтва ў Савецкім Саюзе ідзе шпаркімі крокамі наперад. У гэты-ж час ва ўсіх капіталістычных краінах прамысловы і сельска-гаспадарчы крызіс усё паглыбляецца. Аб соцыяльным страхаваньні, якім карыстаюцца працоўныя Савецкага Саюзу, ангельскія рабочыя могуць толькі марыць.

Дэлегат Польшчы таксама адзначае колёсальную розьніцу, якая існ е паміж становішчам рабочых СССР і Польшчы. Працоўныя масы Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі,—гаворыць дэлегат Польшчы,—з найвялікшай ув гаю сочаць за соцыялістычным будаўніцтвам у СССР, тым больш, што польская буржуазія ў саюзе з Украінскай, беларускай і яўрэйскай рыхтуюць вайну супроць азізнай бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту.

— Кожная новая фабрыка, кожны новы завод, колгас ці саўгас у СССР—гаворыць тав. Муссо (Індонэзія),—зьяўляецца дапамогай міжнароднаму пролетарыяту і прыгнечаным народам колёнй.

— Тое, што мы бачылі і чулі,—заяўляе дэлегат Японіі,—грандыёзьней нават таго, што мы мяркуем. Калі мы ўбачылі грандыёзнае соцыялістычнае будаўніцтва, нам стала асабліва ясна, чаму міжнародны імпэрыялізм рыхтуе вайну супроць СССР. Гэтыя грандыёзныя посьпехі дасягнуты рабочай клясай СССР пад ленінскім кіраўніцтвам УсеКП(б)—перадавога атраду Комінтэрну.

Дэлегат Румыніі раўнае становішча рабочых у СССР з становішчам рабочых і сялян у жандарскай Румыніі. У Румыніі памільёна беспрацоўных. Акрамя гэтага, на шмат якіх прадпрыемствах працуюць толькі 2-3 дні ў тыдзень. Заработак за апошні час зьнізіўся на 30-40 проц. для кваліфікаваных рабочых і на 50-60 проц. для неквэліфікаваных. Рабочы дзень у асобных месцох даходзіць да 14 гадзін. Становішча сялянства яшчэ горшае, нават буржуазны друк прымушан пісаць, што ў шэрагу месц на глебе голаду людзі вар'яцеюць. Такая сучасная Румынія, і пры такім становішчы румынскі фашызм хлусьнёю і тэрорам імкнецца атруціць грамадзкую думку і падрыхтаваць глебу для нападу на СССР.

Рэволюцыйныя выступленьні францускіх салдат

Дэмонстрацыі салдат са сьпевамі рэволюцыйных песен і крыкамі: „Прэч манэўры", „Прэч вайну", сталі звычайным зьявішчам

ПАРЫЖ, 30. З цэлага шэрагу лягераў францускай арміі працягваюць паступаць весткі аб рэволюцыйных выступленьнях салдат.

Масавы прызыў запасных у сувязі з манэўрамі, якія зараз праводзяцца, абвострыў у арміі становішча. Дэмонстрацыі салдат са сьпевамі рэволюцыйных песен і крыкамі: „Прэч манэўры", „Прэч вайну" сталі звычайным зьявішчам.

Асабліва бурна прайшла такая дэмонстрацыя запасных 10 жніўня на Ўсходнім вакзале Парыжу.

У вайсковых лягерах Ларвака, Шалона і іншых месц салдаты адмаўляюцца ад дрэннай яды, кідаюць яду у прысутнічаньні афіцэраў на зямлю і патрабуюць роспуску па дамох.

Востры фінансавы крызіс у Аўстраліі

ЛЁНДАН, 29. Па паведамленьню с Аўстраліі, у сувязі з вострым фінансавым крызісам, які перажы-

прыемств, колгасаў над школамі", калі ў гэту справу будуць уцягнуты шырокія масы працоўнай моладзі і дарослых —толькі тады комсамол зможа выканаць узятыя на сябе перад партыяй абавязкі па шэфству над усеагульным навучаньнем.

вае краіна, рабочы савет правінцыі Новы Паўднёвы Уэльс патрабаваў, каб Аўстралія адмовілася ад уплаты ваенных даўгоў.

Гэтае патрабаваньне ўзбудзіла трывогу ў ангельскіх фінансавых колах. Урадавая ўлада Аўстраліі пагражае ўвесьці газэтную цэнзуру ў выпадку, калі паведамленьні аб агітацыі за адмаўленьне ад аплаты ваенных даўгоў будуць зьяўляцца ў старонках газэт і перадавацца ў Лёндан.

Працоўныя гор. Менску будуць поўнасьцю забясьпечаны бульбай і гароднінай

Толькі з-за злачыннай бязьдзейнасьці паасобных коопэрацыйных і нарыхтоўчых організацый былі створаны перабоі ў забясьпечаньні Менску бульбай

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б абвясьцілі суровую вымову фракцыі МЦРК

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб перабоях у забясьпечаньні г. Менску бульбай ад 29 жніўня 1930 г.

Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б канстатуюць, што, ня гледзячы на перасьцярожлівыя пастановы ЦК і ўрадавых органаў, паасобныя коопэрацыйныя і нарыхтоўчыя організацыі працягваюць злачынную бязьдзейнасьць у справе забясьпечаньня рабочых сельска-гаспадарчымі продуктамі.

Толькі злачыннымі адносінамі і праяўленьнем шкодніцтва з боку паасобных працаўнікоў МЦРК і нарыхтоўчых організацый можна тлумачыць перабоі ў забясьпечаньні Менску бульбай, якая маецца ў БССР у выстарчальнай колькасьці. Выходзячы з гэтага, Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. За нерэагаваньне Праўленьня МЦРК на факты злачынных адносін паасобных яго працаўнікоў а забясьпечаньня менскіх рабочых бульбай і гароднінай, і непрыстасаваньне апарату да стаячых перад ім баявых задач па рабочаму забясьпечаньню—абвясьціць суровую вымову фракцыі Праўленьня МЦРК.

Прэзыдыуму ЦКК КП(б) у працягу дэкаднага тэрміну разгледзець пытаньне аб рабоце МЦРК у сувязі з абсьледваньнем.

2. Прыняць да ведама заяву прокурора, што асобы, вінаватыя ў зрыве рабочага забясьпечаньня гароднінай, арыштаваны і што справа аб іх у судзе будзе заслухана ў пяцідзённы тэрмін.

3) Загадчыку опэрацыйнага аддзелу МЦРК т. Хэўліну за дапушчаныя перабоі ў забясьпечаньні Менску гароднінай і за спробу дыскрэдытацыі партыйнага друку, як с а часова сыгналізаваў аб прарывах у рабочым забясьпечаньні—абвясьціць суровую вымову.

4. Прапанаваць НКГандлю, Белкоопсаюзу і МЦРК пад асабістую адказнасьць т. т. Балціна, Канарэля і Тарасовіча ўжыць конкрэтныя захады, як я-б забясьпечылі поўнае і бесьперабойнае забясьпечаньне г. Менску гароднінай і бульбай.

5. Даручыць фракцыі Гарсавет на бліжэйшым пленуме Гарсавету паставіць справаздачу праўленьня МенЦРК аб забясьпечаньні рабочых г. Менску на зімовы пэрыод бульбай і гароднінай.

Не дазволіць рвачам ганьбаваць завод

Брыгада рвачоў пад кіраўніцтвам Лейкінда выпускала шмат браку, чым ганьбавала ўвесь завод

Партыйныя, профэсыйныя і комсамольскія організацыі не організоўвалі перадавых рабочых-ударнікаў на барацьбу за якасьць продукцыі. Адміністрацыя заводу спадзявалася, што на заводзе „ўсё добра"

ШЫРОКА ВЫКАРЫСТАЕМ ПРАКТЫКУ ПОЛІТ.-ПАКАЗАЛЬНЫХ СУДОЎ, УЗЬНІМЕМ ПІЛЬНАСЬЦЬ РАБОЧЫХ НА БАРАЦЬБУ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПРОДУКЦЫІ, СУПРОЦЬ РВАЦТВА, РАЗГІЛЬДЗЯЙСТВА І БЕЗГАСПАДАРНАСЬЦІ

На суд рабочых мас

На заводзе „Комунар", на гэтым лепшым у свой час па выкананьню прамфінпляну заводзе,—трывога. Завод «Комунар», запісаны ЎсеЦСПС у сьпіс лепшых 25-ці заводаў СССР, здаў свае позыцыі. Завод шпарка крочыць да чорнае дошкі.

Хто вінаваты?

Было гэта 26 жніўня а 3 гадзіне дня, пасьля гудка, як першая зьмена скончыла працу. Сёньня чамусьці ніхто не сьпяшаўся да выхаду. Усе рабочыя, нават тыя, што былі ў адпачынку, ішлі ў заводзкі клюб на політыка-паказальны суд, слухаць справу тых, хто вінаваты ў зрыве пляну на 24 проц., хто сыстэматычна выпускаў брак, веў завод да чорнай дошкі, хто адпачываў на ляўрах, не сачыў за работай цэхаў і заводу.

Прышоўшы ў залю суда, рабочыя імкнуліся да выстаўкі экспонатаў браку, якія знаходзіліся на сцэне на стале. Тут ударнік тав. **Гобэрман**, як старшыня экспэртнай камісіі, растлумачвае прычыны браку і называе вінаватага.

Рабочыя з напружанай увагай сачылі за словамі т. Гобэрмана.

У кожнага рабочага была адна думка: Па чыёй віне заказчыкі прысылаюць лісты з пагрозамі, што яны будуць вымушаны адмовіцца ад заказу, калі „камунараўцы" ня спыняць паток браку.

Хто вінаваты ў тым, што сёньня зробленыя варштат заўтра ізноў перарабляюць? Хто вінаваты ў выяўленым ужо ў 150 сьвідравальных варштатах і 70 зыгмашынах браку? Хто вінаваты ў тым, што бляшаны цэх з 100 фляг дае 90 штук браку? Хто вінаваты?

— Эх, і народу!—скрабе патыліцу адзін з ударнікаў, шукаючы вачыма дзе-б сесьці і, не знаходзячы месца, далучаецца да рабочых, што стаяць ля дзьвярэй.

...Мы вінаваты...

Нарэшце шум і штурханіну у залі заглушыў голас „каманданта" суда:

— Прашу ўстаць, суд ідзе!

Па лаўках ветрам пранеслася: ш-ш-ш!

Адразу неяк нязвычайна паслухмяна рабочыя змоўклі і натапырылі вушы. Кожнаму хутчэй хацелася пачуць тое, што іх хвалюе.

А ўсіх хвалявала адно: „Хто ператварае лепшы завод у горшы?" Старшыня суда, лепшы ўдарнік, электраманцёр **Карначоў**, парзасядацелі—ударнікі заводу, т. т. **Сокалаў, Фішкі-, Савіцкі і Макоўскі**, ад імя рабочых заводу будуць судзіць вінаватых, якія цяпер сядзяць на лаўцы падсудных з нізка апушчанымі галовамі.

Першым абвінавачваецца старшы брыгадзір, у свой час проміяваны, як лепшы ўдарнік зборачнага цэху тав. **Лейкінд**.

Суд суровы, патрабавальны і просты.

Ва ўпор ставяцца пытаньні:

— Чаму замест шпонак вы загаляілі кавалкі дроту, ведаючы аб тым, што гэтым самым вы вытвараеце брак?

Лейкінд тупа глядзіць у падлогу. Сарамліва адварачваецца ад напружаных поглядаў рабочых:

—„Ня я вінаваты ў тым, што атрымаўся брак. Вінаваты курсанты і токарны цэх, якія давалі ўжо бракованыя дэталі.

— Бач ты!—чуцен голас з залі.—Токары заместа шпонак дрот заганялі?!

— Адбрэхваецца об'ектыўнымі прычынамі.

— Да ты ня віляй, гавары проста...

— Вы шкоднікі!..

Рабочыя абвінавачвалі і патрабавалі простага адказу. Прыціснутыя да сьценкі пытаньнямі рабочых, абвінавачаныя былі вымушаны нарэшце прызнацца ў сваіх злачынных адносінах да вытворчасьці.

— Мы вінаваты, — прызнаецца ўрэшце **Лейкінд**.

Грыб у тупіку—Грыб прызнаецца

Другім абвінавачваецца былы сэкратар комсамольскага колектыву, рабочы брыгады **Лейкінда—тав. Грыб.**

— Чаму ты, будучы сэкратаром комсамольскага колектыву,—пытаецца суд,—будучы ініцыятарам соцспаборніцтва і ўдарніцтва, ты—кіраўнік комсамолії заводу, які павінен сачыць за тым, каб ніхто не рабіў браку,—ты сам дапусьціў яго?

— Ня мы вінаваты ў гэтым. Нам давалі бракаваныя дэталі.

— Чаму ты, атрымліваючы нягодныя часткі з такарнага цэху, не казаў аб гэтым нікому, ня ставіў пытаньня на вытворчай групе, а з ораку рабіў варштаты?..

— Я баяўся, што мяне абвінавацяць у рвацтве...

Заля выбухае сьмехам. Знайшоў адгаворку!—сьмяюцца рабочыя.

Грыб у тупіку, Грыб ня ведае чым адгаварыцца, і яму таксама прыходзіцца прызнацца, што ён, а таксама і ўся брыгада Лейкінда, займалася рвацтвам і сыстэматычна выпускалі брак.

Майстар Табула баяўся рэзка ставіць пытаньне...

Калі суд стаў допытваць абвінавачанага **Табулу**, дык выявілася, што майстры цэхаў ня конвалі сваіх абавязкаў, не старыстоўвалі сваіх правоў адзінаначальля, ня сочаць за працай рабочых. Так, напрыклад, з-за таго, што Табула кепска глядзеў за работай свайго цэху, яму толькі на 150-м варштаце ўдалося выкрыць шкодніцтва і браку, а не папярэдзіць яго адразу.

Табула ў сваё апраўданьне стараўся выдумаць шмат об'ектыўных прычын. Вінаваты, моў, ня ён, а цякучасьць рабсілы, бязьдзейнасьць усіх заводзкіх організацый. Ён нават дашоў да таго, што баяўся рэзка паставіць пытаньне аб тых, хто рабіў брак, бо ён „баяўся, што яны пакінуць завод". А выпускалі бракаваную прадукцыю многія і тав. Табула гэта бачыў.

Па недагляду майстраў прыпісвалі нявыкананыя работы. На судзе падавалася шмат такіх фактаў.

Усе пакрыху пахропвалі...

Пасьля **Табула** абвінавачваецца старшыня вытворчае групы цэху **Сакалоўскі**. Тут выяўляецца поўная бязьдзейнасьць профэсыянальных організацый у справе барацьбы за прамфінплян.

Старшыня суда задае **Сакалоўскаму** пытаньне:—Колькі нарад вытворчае групы адбылося з мая месяца?—Сакалоўскі адказвае:—адна, ці дзьве,—добра не памятаю.

Нават больш таго—**Сакалоўскі** не памятае, якія пытаньні разгляндаліся на пасяджэньнях групы. Ён ня ведае таксама колькі рабочых працуе ў яго цэху.

— Значыцца вы спалі?—задаецца пытаньне.

Сакалоўскі адказвае:

— Спала ня толькі вытворчая група, але пахрапвалі пакрысе ўсе організацыі заводу. Таму наш завод дакаціўся да такіх буйных прарываў.

— Толькі шкада,—дадае ўрэшце **Сакалоўскі**.—што гэты суд ня быў наладжаны два месяцы таму назад. Калі-б ён быў тады, мы зараз на заводзе ня мелі-б такога становішча.

Абыйдзецца як-небудзь...

Пасьля **Сакалоўскага** абвінавачваецца галоўны кантралёр-прыёмшчык Скрыпко. Віна яго ў тым, што ён нядбайна адносіўся да прыёмкі выробленых дэталяй і варштатаў. Гэта ён гаварыў рабочым—„не важна, што часьць не падыходзіць і хістаецца—абыйдзецца як-небудзь!.." чым і даваў магчымасьць рвачам і гультаям і надалей выпускаць брак.

Скрыпко, ведаючы даскапала аб браку, абмяжаваўся тым, што сказаў аб гэтым майстрам цэхаў і дырэктару заводу т. **Левіну**, і бачачы іх бязьдзейнасьць не паведаміў заводзкія грамадзкія організацыі. На пытаньне суда,—чаму, ведаючы аб браку, не сыгналізавалі аб гэтым праз насьценгазэту,—Скрыпко адказвае:

— Быў заняты работай больш сур'ёзнай, я—член гарсавету.

Заво „Камунар" топіцца ў браку, а галоўны прыёмшчык,—член партыі Скрыпко,—не сыгналізуе аб гэтым. Нават больш таго—не клапоціцца весьці ўлік гэтай ганебнай плыні, хаця брак з кожным днём павялічваецца.

Суд у сваёй 3-дзённай рабоце ня толькі выявіў конкрэтных вінаваўцаў зрыву плянавых заданьняў заводу, але разгарнуў сапраўдную бальшавіцкую самакрытыку, здолеў выявіць ўсе тармазы ў барацьбе ўдарнікаў за выкананьне прамфінпляну.

Суд выявіў, што ў зрыве пляну вінаваты ня толькі шэсьць таварышоў, як я сядзелі на лаўцы падсудных, але і тыя, якія пасьля хвалебных гымнаў у друку аб дасягненьнях заводу „Комунар" адпачывалі на ляўрах, думаючы, што у нас ўсё добра" і паслабілі кіраўніцтва работай цэхаў.

З-за адсутнасьці ўвагі да работ з боку партыйных і грамадзкіх організацый, у адміністрацыі ляжыць без руху каля 400 прапаноў рабочых.

Можа і павінен выканаць...

Завод „Комунар" можа і павінен выканаць і перавыканаць плянавыя заданьні!

Такое было патрабаваньне суда грамадзкасьці.

Пасьля прыгавару абвінавачаныя **Лейкінд і Грыб** падалі на імя суда заяву, што яны, прызнаючы сваю віну і асуджаючы свой учынак, даюць слова зьняць накладзеную на завод пляму.

— Да канца гаспадарчага году,—гаворыцца ў іх заяве,—выканаем перавыканаем плян па зборцы варштатаў!

Суд уліў жывы струмень у рабочую ініцыятыву, узьняў яе дух. Першы-ж дзень суда рабочыя другое зьмены дакладвалі, што суд зрабіў пералом у рабоце.

— Брак значна паменшыўся...

Другім заводам БССР трэба па прыкладу „Комунара" наладжваць політыка-паказальныя суды.

Рвачоў, безгаспадарнікаў, байнікоў—на суд рабочых мас.

Ціш а Верны.
Янка Зыкаў.

Думалі... Спадзяваліся...

А міністрацыя, партыйная, комсамольская і профэсыйная організацыі, думаючы, што на заводзе „Комунар" „усе добра", паслабілі кіраўніцтва соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам на заводзе. У выніку—у ліпені і жніўні атрымаўся вялікі прарыў.



Адміністрацыя—Мы думалі, што „ўсё добра... Спадзяваліся... А тут ніякага эфэкту няма.

На парадку дня—жывёлагадоўля

Шпаркі рост індустрыі стварыў моцную аснову для соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Наперакор панікёрскім сьцьвярджэньням правых опортуністых аб дэградацыі сельскай гаспадаркі наша партыя на базе буйнэй соцыялістычнай прамысловасьці забясьпечыла карэнны паварот вёскі на соцыялістычны шлях разьвіцьця.

Аб'ядноўваючы дробныя, распыленыя сялянскія гаспадаркі ў колгасы, разгортваючы савгаснае будаўніцтва, ліквідуючы кулака як клясу на аснове суцэльнай колектывізацыі, пролетарыят пад кіраўніцтвам партыі вырашыў у асноўным збожжавую проблему і перавыканаў пяцігодку па колгаснаму будаўніцтву ў два гады.

У бягучым годзе пасеўная плошча збожжавых культур упяршыню перавысіла даваенны ўзровень. Калі плошчу ў 1913 г. прыняць за 100, дык у 1927—28 г. пасеўная плошча складала 94,7 проц., у 1928-29.—98,2 проц., і, па ўсіх даных, у гэтым годзе—105,1 проц. ад даваеннага ўзроўню.

Адны толькі збожжа-савгасы дадуць 100 мільёнаў пудоў хлеба, а ўвесь соцыялістычны сэктар сельск. гаспадаркі, савгасы і колгасы, дадуць больш палову таварнага хлеба краіны.

Таварыш Сталін на 16 парт. зьезьдзе гаварыў:

„Выходзіць, што вырашэньне збожжавай проблемы зьяўляецца асноўным зьвяном у сыстэме сельскай гаспадаркі і ключом да вырашэньня ўсіх другіх проблем апошняе". (Сталін, даклад на 16 парт. зьезьдзе).

Збожжавая проблема на базе савгаснага і колгаснага будаўніцтва зьяўляецца асноўным зьвяном ня толькі для вырашэньня жывёлаводчай гаспадаркі і тэхнічных культур, але і рашаючай умовай шпаркага ўздыму ўсяе сельскае гаспадаркі. Чаму? Ды таму, што ня вырашыўшы проблемы збожжавай гаспадаркі, немагчыма разьвіваць жывёлагадоўлю.

Для ілюстрацыі правядзем толькі адзін прыклад з дакладу тав. Якаўлева на зьезьдзе партыі. У апошні год пяцігодкі для 7 мільёнаў галоў стада „Сьвінаводу" патрэбна будзе (у пераводзе на збожжа) больш 33 мільёнаў цэнтнэраў армоў. Таксама патрабуецца значнае павялічэньне кармоў для кароў, авец, коз.

Стала-быць пасьпяховае вырашэньне проблемы жывёлагадоўлі органічна залежыць ад далейшага ўздыму збожжавай гаспадаркі.

Аднак, на якой-жа аснове магчыма ажыцьцёвіць гэтыя задачы? Па якім шляху павінна разьвівацца вёска з тым, каб пасьпяхова і цалкам вырашыць збожжавую проблему і побач з гэтым разьвіваць іншыя галіны сельскай гаспадаркі?

На гэта пытаньне тав. Сталін даў поўны, вычэрпваючы адказ. Ён гаварыў на XVI зьезьдзе:

„Ці магчыма ажыцьцёвіць усе гэтыя ўмовы на базе дробнай сялянскай гаспадаркі? Не, немагчыма. Немагчыма, бо дробная сялянская гаспадарка ня ў сілах прыняць і асвоіць новую тэхніку, ня ў сілах падняць у выстарчальнай ступені вытворчасьць працы, ня ў сілах павялічыць у выстарчальнай меры таварнасьць сельскай гаспадаркі".

„Адсюль задача насаджэньня савгасаў і аб'яднаньня дробных сялянскіх гаспадарак у буйныя колектыўныя гаспадаркі, як адзіны шлях вырашэньня проблемы сельскай гаспадаркі, ... збожжавой проблемы у п... насьці".

На гэты шлях наша партыя ўстала ў практычнай рабоце стала зараз пасьля XV зьезду партыі. І толькі ў рашучай барацьбе з правымі ухіламі у партыі і комсамоле (як галоўнай небясьпекай на даным этапе), з „левымі" антысерадняцкімі перагібамі ў колгасным будаўніцтве, з прымірэнствам да ўхілаў, у жорсткай барацьбе з нашым злейшым клясавым ворагам—кулаком, пад кіраўніцтвам партыі рабочая кляса, апіраючыся на батрацтва і беднату, у саюзе з сярэднім сялянствам, пасьпяхова індустрыялізуе краіну і ператварае сельскую гаспадарку на соцыялістычнай **аснове**.

Побач з канчатковым вырашэньнем пытаньня аб збожжавай гаспадаркі, як галоўнай асновы пасьпяховага ўздыму сельскай гаспадаркі 16 партыйным зьездам пастаўлен цэлы шэраг новых задач у галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі.

На зьезьдзе т. Сталін гаварыў, што „усьлед за збожжавай проблемай, якую мы ўжо вырашаем у асноўным з посьпехам, паўстае перад нам проблема мясная, вастрата якой адчуваецца ўжо зараз і якая чакае свайго вырашэньня".

У рашэньнях 16 партыйнага зьезду па дакладу т. Якаўлева гэтыя задачы адлюстраваны выключна чотка: „Забясьпечыць, побач з паскораным разьвіцьцём збожжавых і тэхнічных культур, уздым і ўзмоцненае разьвіцьцё жывёлагадоўлі шляхам перш за ўсё організацыі спэцыяльных жывёлагадоўчых савгасаў, аналёгічна збожжавым савгасам, масавага стварэньня высокатаварных колгасных форм і шпаркага пашырэньня кармовай базы".

І. Гаўрушы...

(Канец заўтра)

...—ЯШЧЭ НЕ ЗАЦЬВЕРДЗІЛІ ЦЫРКУЛЯРАЎ!

ДА ПАЧАТКУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ ЗАСТАЎСЯ АДЗІН ДЗЕНЬ

БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЮ, КАЗЁННЫМІ БЮРОКРАТЫЧНЫМІ АДНОСІНАМІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ НАРКАМАСЬВЕТЫ, МЕНСКІ ГАРСАВЕТ І ІНШ. ГАСПАДАРЧА-ПРОФЭСЫЙНЫЯ ОРГАНІЗАЦЫІ ФАКТЫЧНА ЗРЫВАЮЦЬ ПАСТАНОВУ ПАРТЫІ АБ УСЕАГУЛЬНЫМ НАВУЧАНЬНІ

Комсамольскія організацыі Менску, прыняўшы шэфства над усеагульным навучаньнем, стаяць у баку ад гэтай важнейшай політычнай задачы

Неадкладна мобілізаваць шырокія масы працоўных на вырашэньне баявых задач усеагульнага навучаньня

„Пасьпяховае ажыцьцяўленьне ўсеагульнага абавязковага навучаньня будзе вялізарнейшай перамогай не тольні на культурным, але і на політычным і гаспадарчым франтох“.

СТАЛІН.

У пастанове ЦК УсеКП(б) аб усеагульным абавязковым навучаньні сказана, што „разьвіцьцё соцыялістычнага будаўніцтва і зьвязаныя з гэтым задачы па падрыхтоўцы кадраў, ліквідацыі культурна-тэхнічнай адсталасьці і комуністычнаму выхаваньню шырокіх мас патрабуюць хутчэйшага праводзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня, як важнейшай прадпасылкі да далейшага разьвіцьця культурнай рэволюцыі“.

Такім чынам, пытаньне аб усеагульным абавязковым навучаньні на сёньняшні дзень зьяўляецца аднэй з цэнтральных задач нашых партыйных, гаспадарчых профэсыйных і комсамольскіх організацый.

Аднак, гэтае вялізарнейшае па сваёй політычнай значнасьці мерапрыемства, яшчэ не знайшло належнага практычнага праламленьня ў рабоце тых беларускіх установаў, якія павінны быць непасрэднымі праваднікамі рашэньняў партыі і ўраду па гэтаму пытаньню.

Налёт на Наркамасьветы БССР, які быў праведзен рэдакцыямі газэт „Савецкая Беларусь“, „Чырвоная Зьмена“ і „Піонэр Беларусі“, выявіў паўнейшую безадказнасьць і галавацяпства з боку паасобных кіраўнікоў Наркамасьветы, поўную непадрыхтаванасьць да практычнага ажыцьцяўленьня задачы ўсеагульнага навучаньня і падрыхтоўкі да надыходзячага навучальнага году.

Гэткае-ж становішча было выяўлена ў іншых цэнтральных установах БССР, якія мелі непасрэднае дачыненьне да навучальнага году (Белдзяржгасцэнтр, Белкоопсаюз, Белдзяржвыдавецтва і г. д.).

Зараз мы маем на ўвазе паказаць дзейнасьць Менскага гарсавету ў галіне практычнага ажыцьцяўленьня пастановы партыі і ўраду аб усеагульным навучаньні. На вялікі жаль, „дзейнасьць“ гарсавету зьвялася выключна да заслухоўваньня аднэй справаздачы і бюрократычнай адпіскі аб пачатку навучальнага году.

„Заўтра, заўтра, а ня сёньня“...

Заўтра пачынаецца, вярней павінен пачацца навучальны год.

Але калі мы запыталіся што канкрэтнага зрабіў гарсавет для выкананьня пастановы партыі, нам адказалі:

— Мы яшчэ не зацьвердзілі рэзолюцыі. Яна павінна быць заўтра альбо пасьлязаўтра!..

Бачыце! Гарсавет чакае на заўтра нават на пасьлязаўтра. Заўтра ўжо дзеці прыходзяць у школу, будуць шукаць падручнікаў, сшыткаў, нават прытулку, дзе правесьці заняткі. А гарсавет... ён дзесьці будзе ў пасяджэнчай габінэтнай мітусяніне зацьвярджаць прыгожыя рэзолюцыі. Гарсавет уздумаў „пакіраваць“ гэтай работай толькі.. 28 жніўня. У гэты дзень ён „соизволил“ заслухаць на сваім прэзыдыуме даклад інспэктара Нарасьветы аб падрыхтоўцы да навучальнага году. Гэта значыць толькі напярэдадні пачатку навучальнага году гарсавет даведаўся, што „на Шыпцы ў ўсё спакойна“.

У гарадзкой інспэктуры Нарасьветы наша брыгада выявіла абураючыя факты бязьдзейнасьці. Вялікія цяжкасьці сустрэліся пры рамонце школьных памяшканьняў. Яны рамантаваліся па ініцыятыве інспэктуры, а прэзыдыум гарсавету на ўсё гэта толькі здаволена ківаў галавой:

— Так, так! Працуйце, браткі, старайцеся!..

Вось у чым конкрэтна выявілася ўся практычная дапамога прэзыдыуму гарсавету. А рамонт некаторых школ яшчэ і зараз ня скончаны (школы 2, 24 і 12).

Згодна падлікам інспэктуры Нарасьветы ў надыходзячым навучальным годзе апрача дзяцей, якія навучаліся летась і ў мінулыя гады і нармальнага павялічэньня вучняў за лік новапаступаючых—у Менскія школы павінна быць прынята каля 800 вучняў ва ўзросьце ад 11 да 15 год, якія яшчэ ня былі ахоплены школамі і, згодна закону аб абавязковым усеагульным навучаньні, павінны сёлета навучацца ў школах.

Такім чынам і плошча пад школ мі павінна значна павялічыцца. У інспэктуры Нарасьветы падлічана, што на сёньняшні дзень да пачат у навучальнага году ў Менску не хапае 46 пакояў школьнай плошчы. Гэта пры ўмове навучаньня ў дзьве зьмены. А калі-ж прыняць пад увагу тое, што частка пазьменных школ узвышанага тыпу для рабочай моладзі павінна таксама распачаць заняткі, дык недахоп плошчы пад клясы значна павялічваецца.

44 пакоі... пад былымі і цяперашнімі загадчыкамі

Што робіць гарсавет, каб забясьпечыць школы плошчай і ці рацыянальна скарыстана тая плошча, што замацавана за школамі і прызначана для іх?

Аказваецца, што 44 клясныя пакоі, дзе маглі-б займацца, у адну толькі зьмену, 44 комплекты,—заняты пад... кватэры былымі і цяперашнімі загадчыкамі школ.

Справа ў тым, што згодна палажэньня аб загадчыках школ апошнім прадстаўлялася кватэра ў школьным памяшканьні. Гэтак было і ў Менску. Але тут, калі загадчык школы, па тэй ці іншай прычыны, пераставаў быць загадчыкам,—школьная кватэра за ім пакідалася, а новаму загадчыку адводзілась новая кватэра, і зноў такі ў школьным памяшканьні.

Такім чынам, некаторыя школы настолькі абрасьлі загадчыкамі, што ня было месца і вучням.

У школе № 1 напрыклад увесь другі паверх заняты жыхарамі з былых загадчыкаў. У „Піонэрскай Комуне“ за апошні год зьмянілася 4 загадчыкі і ўсе яны атрымалі кватэры ў школьным памяшканьні. Гэтак і па іншых школах.

Калі ж праходзіла ліквідацыя менскіх акруговых установаў, СНК БССР выдаў пастанову аб тым, каб 50 проц. памяшканьняў, якія аслабаняюцца пры ліквідацыі, перадаць пад школы. Але гарсавет гэтай пастановы, мабыць, ня чытаў, бо школы не атрымалі ніводнага пакою.

Ці атрымаюць бяднейшыя вучні дапамогу?

Сёлета асыгнаваньні мясцовага бюджэту павялічаны ў параўнаньні з мінулым годам на 50 проц. Частка сродкаў для бяднейшых вучняў будзе сабрана самімі школамі. Усё гэта, па прыблізных падліках, павінна скласьці суму звыш 70.000 рублёў, альбо звыш 15 рублёў на кожнага вучня, якому патрабуецца дапамога. Пры правільным і эканомным скарыстаньні гэтых сродкаў на самыя першачарговыя неабходнасьці, можна дабіцца таго, што бяднейшыя вучні ў асноўным будуць забясьпечаны.

Але тут якраз і прышлося ўпёрціся ў бюрократычную сьцяну праўленьня ЦРК, куды па некалькі разоў хадзілі высьвятляць пытаньне аб скарыстаньні гэтых сродкаў. Асабліва дрэнна стаіць пытаньне з забясьпечаньнем вучняў гарачымі сьнеданьнямі і абедамі. Інспэктарыят Нарасьветы прадставіў МЦРК некалькі проэктаў забясьпечаньня вучняў гарачым харчаваньнем.

Аднак МЦРК яшчэ і дагэтуль ня вырашыў гэтага пытаньня.

— Калі-небудзь будзе склікана камісія, якая „канчаткова“ вырашыць гэтыя пытаньні,—так заяўляюць прадстаўнікі МЦРК. Гарсавет пасьля гэткага адказу, таксама супакоіўся.

З забясьпечаньнем падручнікамі справа таксама вельмі дрэнная. Цалкам будзе забясьпечаны толькі першы концэнтр і то некаторыя падручнікі выйдуць са спазьненьнем. Адчуваецца вялікі недахоп у навучальных програмах і навучальных дапаможніках. Аб гэтым гарсавет у свой час не паклапаціўся.

„Політэхнізм“ у разуменьні інспэктарыяту Нарасьветы

Колькі гарачых прамоў і рэзолюцый выносілася на сходах, спэцыяльна прысьвечаных пытаньню політэхнізацыі школ. Комсамол моцна ваяваў за політэхнічную школу. У Менску была склікана спэцыяльная нарада, тады яшчэ акруговых, інспэктароў спэцыяльна па вырашэньню пытаньня аб політэхнізацыі школ. Нарада вынесла цэлы шэраг практычных прапаноў, рэзолюцый аб найхутчэйшым разгортваньні работы ў гэтым напрамку.

Але... На вялікі жаль, для менскай інспэктуры ў прыватнасьці, а для гарсавету наогул, гэта засталося „голасам у пустэчы“.

— Што вы хочаце? Летась мы ўжо праводзілі гэтую работу!—заяўляе нам інспэктар.

— Так, — сапраўды „праводзілі“. Але ня тое, што трэба. Ня тое, што мы разумеем пад перабудовай нашай школы на політэхнічныя рэйкі.

У школах прывіваліся працоўныя звычкі. Вывучвалі так званыя працоўныя процэсы. Адзін раз у тыдзень дзеці хадзілі ў спэцыяльна прыстасаваную сталярную майстэрню і там займаліся па гадзіне, альбо па поўгадзіне, ці як інакшай. Некалькі менскіх школ былі прымацаваны да прадпрыемстваў, куды яны наладжвалі экскурсіі. Гэткім чынам інспэктура Нарасьветы політэхнізавала школу, „прывівала“ працоўныя звычкі...

А цяпер!.. О, цяпер!..

— Мы ўжо шэсьць дзён як адчынілі курсы для настаўнікаў, якіх спэцыяльна падрыхтоўваем для політэхнізаванай школы. Там яны вывучваюць рашэньні зьездаў партыі, працоўныя процэсы і г. д. і г. д.—заяўляе нам інспэктар.

Бачыце, за шэсьць дзён да пачатку навучальнага году адчынілі гэтыя курсы. І на гэтым... кропка.

Пролетарская грамадзкасьць не мобілізавана навокал гэтага важнейшага політычнага мерапрыемства. Профсаюзы, гарсавет, комсамольскія організацыі нічога не зрабілі ў галіне перабудовы школ на політэхнічныя рэйкі. Ніводзін профсаюз не „адважыўся“ нават паставіць аб гэтым пытаньне на сваіх пасяджэньнях.

Па рабочай асьвеце сёлета спэцыяльна будуць адчынены 8 школ узвышанага тыпу для рабочай моладзі (5 на беларускай мове, 3—на яўрэйскай). Комплектаваньне ў рабочыя школы працягнута да 5 верасьня. Інспэктура заяўляе, што з укомплектаваньнем настаўнікамі, забясьпечаньнем прыладамі ўсё абстаіць добра. Але ў гэтым прыходзіцца сумнявацца. Бо вячэрнім школам рабочай моладзі заўсёды прыходзіцца быць пад непасрэдным кіраўніцтвам школ соцвыху. У апошніх яны павінны браць і падручнікі і прылады і г. д.

Малюнак з „КП“

Піраміда, якая пагражае абвалам

Гарсавет яшчэ ні разу не заслухаў справаздачы аб становішчы ліквідацыі няпісьменнасьці па Менску. А ў гэтым-жа напрамку маецца цэлы шэраг прарываў. Не хапае настаўнікаў для кіраўніцтва групамі „Прэч няпісьменнасьць“. Грамадзкія організацыі ня ідуць насустрач гэтаму важнейшаму пытаньню. Профсаюзы, комсамольскія організацыі гораду не забясьпечваюць кіраўнікамі груп па ліквідацыі няпісьменнасьці і нічога ня робяць па ўцягненьню няпісьменных рабочых у гэтыя гурткі.

Цяпер аддзелам Нарасьветы з 1-га верасьня па 1-е сьнежня абвяшчаецца трохмесячнік паходу за грамату пісьменнасьць. Месячнік выстаўляе цэлы шэраг практычных мерапрыемстваў у барацьбе за ўсеагульную пісьменнасьць Савецкай Беларусі. З боку грамадзкіх партыйных, комсамольскіх організацый патрабуецца надзвычайная актыўнасьць у вырашэньні гэтай важнейшай кампаніі.

Выходзячы з усяго вышэйпаданага, мы можам зрабіць вывады, што шмат якімі організацыямі была праяўлена злачынная нядбайнасьць у правядзеньні задачы партыі аб усеагульным навучаньні і падрыхтоўцы да навучальнага году.

У шмат якіх школах навучальны год знаходзіцца пад пагрозай зрыву з-за адсутнасьці памяшканьняў, належных прыладаў, настаўнікаў і г. д.

Трэба па-баявому мобілізаваць усю пролетарскую грамадзкасьць на вырашэньне баявой задачы ўсеагульнага навучаньня. Трэба не шкадуючы біць па тых, хто імкнецца змазаць політычны сэнс гэтага мерапрыемства.

Комсамольскія організацыі Менску павінны напрудзіць усе сілы для таго, каб ні ў якім разе не дапусьціць зрыву навучальнага году.

С. Сьляпян.
Пакроўскі.

Сёньня пачынаецца навучальны год—трэба хутчэй зацвердзіць рэзолюцыю

Ліст з Кабула

Індыя ахоплена пажарам паўстаньня

Крывавая расправа над удзельнікамі антыбрытанскага паўстаньня ў Пешаверы не прайшла бясьсьледна ні для ангельцаў, ні для працоўных Індыі.

На другі дзень пасьля гэтай расправы „Таймс“ пісаў, што „пройдзе яшчэ некаторы час, перш чым рэха кулямётаў перастане гучэць у сьценах гораду. Небясьпека ня будзе зьнішчана, пакуль не замруць апошнія гукі стрэлаў“. З таго часу да кулямётаў далучыўся гарматны грохат і залпы шматтысячнай ангельскай арміі.

Цяжкое экономічнае становішча, нясьцерпныя падаткі, рабаўнічы разгул чыноўніцтва і брытанскай ваеншчыны —вось прычыны, якія прывялі да паўстаньня шматлікіх плямён у паўночна-заходняй Індыі.

Племя афрыдыяў, падняўшае першым паўстаньне, заявіла, што справу вызваленьня пешаварскіх індуса у Пешавары яно лічыць сваёй справай. Плямёны, раскінутыя на поўнач і захад ад Пешавару, далучыліся да афрыдыяў. Зараз ва ўзброеную барацьбу ўцягнута 9 плямён, звыш паўтара мільёны чалавек, якія выставілі 50.000 байцоў.

Уся паўночна заходняя Індыя з яе цэнтрам Пешаварам ахоплена пажарам паўстаньня.

Галоўнейшыя гарады: Пешавар, Кохат, Парачапар, Наўшар і інш. ахоплены паўстанцамі. Фронт барацьбы працягнуўся на 1000 з лішнім кілёмэтраў. Пяхота і кавалерыя, артылерыя і танкі паветраныя эскадрыльлі і провокацыя—усё пушчана ў ход ангельскімі імпэрыялістымі. У адным толькі раёне Пешавару скідаецца штодзённа 7.000 бомбаў.

Эскадрыльлямі разбураны сотні вёсак. Эвакуяваўшы белае насельніцтва з гарадоў, ангельскія „просветители“ амаль штодзённа наладжваюць крывавыя бані туземнаму насельніцтву ў асаджаных паўстанцамі гарадох. І ўсё-ж барацьба разрастаецца.

У шэрагі паўстанцаў уліваюцца тысячы індыйскіх нацыяналістых. Мірнае сялянскае насельніцтва—на баку „бунтаўшчыкоў“. Яно шырока організавала забясьпечаньне іх продуктамі і дае ім сродкі перасоўваньня.

Ангельскае вайсковае камандваньне, якое імкнулася ў пачатку абмаляваць паўстаньне афрыдыяў, як просты разбой, зараз забіла трывогу і разам з буржуазным друкам гаворыць аб „стварыўшымся надзвычайна цяжкім становішчы“.

І сапраўды, лёзунг „Вон ангельцаў з Індыі“ становіцца ўсё больш грозным для ангельцаў. Праўда некаторыя буржуазныя пісакі, якія схлусіліся да адказу, усё яшчэ працягваюць пісаць аб „руцэ Масквы“.

Аднак, буржуазія добра разумее, што барацьба ў Пешавары — адзін з вучасткаў агульнага антыімпэрыялістычнага фронту барацьбы працоўных усяе Індыі.

Менш за ўсё ангельцы чакалі такой упартасьці з боку паўстаўшых плямён. Вось ужо каля месяцу ідуць бязупынныя баі, а брытанская армія ні на крок не пасунулася ўперад. Асвоіўшыся з тактыкай ангельскіх войск, паўстанцы надзвычайна добра прыстасобіліся да паветраных бомбардыровак. Вытрымліваючы жорсткія баі яны ў даліне Бара і ў раёне цяжка праходных гор прымушаюць уцякаць шматколькасную брытанскую пяхоту і кавалерыю.

Частыя паражэньні раскладаюць англа-індыйскія войскі. Прычым, як гэта мела месца ў Пешавары, частка войск імкнулася далучыцца да паўстанцаў.

Паасобныя атрады плямён пранікаюць у ангельскі тыл. Яны дэзорганізуюць яго захватваюць ваенныя склады, узрываюць масты і г. д. Дзякуючы падтрыманьню насельніцтва, гэтыя атрады нязлоўны для брытанскіх войск, і стратэгічныя пункты паўночна-заходняй Індыі знаходзяцца пад штогадзіннай пагрозай паўстанцаў.

Антыімпэрыялістычны фронт у Індыі выраўніваецца. Упартая ўзброеная барацьба плямён супроць ангельскага панаваньня паказвае, што рабочыя і сяляне адыходзяць ад дэмагогіі і здрадніцкай політыкі Ганды з яго прапаведзьдзю „мірнага супраціўленьня“ ангельскім катам. Працоўныя Індыі на практыцы пераконваюцца што адзіны сродак вызваленьня — гэта ўзброеная барацьба.

Мухамэд Оглу.

Кабул.
Жнівень 1930 г.

На пасяўным фронце колгасна-вытворчага паходу

...ФОРМАЛІН ЛЯЖЫЦЬ НА СКЛАДАХ,

а слуцкі сеюць непратручаным насеньнем азімыя

Комсамольскія ячэйкі, не дапусьцеце таго, каб ляглі ў глебу непратручаныя зерні жыта і пшаніцы! Справа пратручваньня насеньня азімых—адно з галоўных зьвеньняў асеньняй бальшавіцкай сяўбы

Ня ведаюць свайго вучастку для пасеву

Праведзеная нарада старшынь колгасаў Слуцкага раёну паказала, што колгасы і нават саўгасы яшчэ не гатовы да правядзеньня асеньняга севу.

Яшчэ дагэтуль ні адзін колгас раёну не падрыхтаваў плошчы для сяўбы. У некаторых колгасах адведзеныя пад жыта плошчы яшчэ заняты бульбай, альбо няскошаным атавай канюшыны.

Ёсьць выпадкі, калі колгас яшчэ ня ведае свайго вучастку для пасеву.

Пагражаючае становішча складаецца з выкананьнем плянаў севу і прадугледжаны імі павялічэньнем ураджайнасьці за лік пашырэньня плошчы і правядзеньня агранамічных мерапрыемстваў. Бываюць выпадкі, **калі колгасы, апрацоўваючы пасеўныя пляны, скарацілі іх на 5-20 га.**

Надзвычайна дрэнна праводзяцца агромерапрыемствы, асабліва ўгнаеньне глебы. Нават колгасы, у якіх вапна пад бокам, і то ня думаюць вапнаваць.

Многія колгасы сеяцьмуць азімыя на жытнішчы, дзе патрэбна добрае мінэральнае ўгнаеньне. А гэтае ўгнаеньне ў колгасы яшчэ не завезена. Справа з пратручваньнем насеньня пшаніцы і жыта на мясцох зусім яшчэ не разгорнута. Слуцкі РВК хоць і мае формалін, але трымае яго на складзе райземчасткі.

Да сельсаветаў яшчэ не прымацаваны адказныя працаўнікі па пратручваньню насеньня азімых.

Партыйным і комсамольскім ячэйкам, а таксама і ўпаўнаважаным райкому і РВК неабходна зараз-жа прыняць належныя захады да ліквідацыі адзначаных недахопаў. Неабходна мобілізаваць масы на 100-процантнае выкананьне плянаў асеньняга севу.

Прарывы ў падрыхтоўцы да асеньняга севу павінны быць ліквідаваны.

Анатолін.

Плятуцца ў хвасьце

У колгасе імя **Дзяржынскага** (Плешчаніцкі раён) пагражаючае становішча з уборкай і падрыхтоўкай да асеньняга севу.

Плугі яшчэ не адрамантаваны, а ўжо трэба прыступіць да сяўбы. На полі стаіць ня прыбраным 40 проц. жыта. Сенажаці скошана на 20 проц. ды і тое сена гніе. У колгасе поўная бесгаспадарнасьць, шмат інвэнтара пагублена. Ударніцтва і соцспаборніцтва не арганізавана. Комсамольская ячэйка плянцецца ў хвасьце адсталай масы.

Колгасьнікі выходзяць на работу а 10-11 гадзіне.

Комсамолец **Сьвідрыцкі** уцёк з працы ў нядзелю, ня гледзячы на тое, што з брыгадай, у якой быў і комсамолец **Сьвідрыцкі**, пайшлі працаваць старыя колгасьнікі.

Колгас **Дзяржынскага** мае моцную эканамічную базу, але дрэннае кіраўніцтва не дае магчымасьці як належыць расьці і працаваць гэтаму колгасу.

Райкому партыі і комсамолу неабходна зацікавіцца становішчам колгасу.

Гурэв ч.

Чаго яны чакаюць?

Сьмілавіцкі раён не падрыхтаваны да асеньняй пасеўкампаніі. Яшчэ дагэтуль нідзе няма пляну асеньняй кампаніі. Мясцовыя організацыі нічога ня робяць.

Раён не забясьпечаны штучным угнаеньнем. Заявы ад колгасаў і саўгасаў аб задавальненьні іх угнаеньнем не атрымоўваюць ніякага адказу.

Шмат якія колгасы („Чырвоны Профінтэрн", колгас Сталіна) з прычыны адсутнасьці ўгнаеньня, зусім не падрыхтоўваюць зямельнай плошчы пад азімыя пасевы. Ёсьць пагроза, што ў раёне значная колькасьць зямлі ня будзе засеяна.

Лепш пастаўлена справа ў колгасе „Барацьба", тут ужо канчаецца ўборка. Жніво і касьбу скончылі. Цяпер колгасьнікі прыступаюць да абмалоту. Бядейшая частка колгасьнікаў ужо забясьпечана хлебам з новага ўраджаю.

А. Войтка.

Прыехаў на... адпачынак

Кухценьская ячэйка ЛКСМБ Вузьдзенскага раёну зьяўляецца адной з найвялікшых ячэек раёну. Але, на вялікі жаль, яна ня выконвае ўскладзеных на яе задач па дапамозе ў правядзеньні ўборачнай кампаніі і падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы! Комсамолец—студэнт Слуцкага педтэхнікуму Фэрдзер Барыс, які прыехаў на адпачынак і зараз знаходзіцца на вучоце ў кухценьскай ячэйцы ЛКСМБ, нічога ня робіць у правядзеньні ўборачнай кампаніі, тады як колгас адчувае вялікі недахоп у рабочай сіле.

Комсамолка тэй-жа ячэйкі, якая жыве ў колгасе 1 мая,—Сулер І. ходзіць на працу толькі ў тыя дні, калі ёй падабаецца. У пятніцу бывае на рабоце да поўдня, бо рыхтуецца да суботы.

Маецца і яшчэ цэлы шэраг фактаў надбайных адносін з боку пасобных комсамольцаў да правядзеньня важнейшых політычных кампаній.

Райдо.

„Прынцыповая" беспрынцыпнасьць

У Ленінградзе існуе ўсесаюзны тэхнікум швейнай прамысловасьці. У задачы яго ўваходзіць падрыхтоўка сярэдня-тэхнічнага і кіраўнічага пэрсоналу для швейнай прамысловасьці. Здаецца, што з боку Белшвейтрэсту павінна быць у дастатковай меры зьвернута ўвага на гэты адзіны ў СССР тэхнікум.

Замест гэтага мы назіраем толькі казённыя бюрократычныя адносіны да справы ўкомплектаваньня сцарыстаньня магчымасьцяй, якія дае тэхнікум.

Вясной г. г. на Віцебскую швейную фабрыку былі пасланы 3 студэнты-выпускнікі для праходжаньня бесьпераПыннай вытворчай практыкі. Але, замест прыёму і дапамогі, іх на працу ня прынялі. Студэнты прымушаны былі зьвярнуцца назад. Белшвейтрэст раціў сам накіраваць экспэдыцыю ў тэхнікум, каб высьвяціць, ці сапраўды такі існуе.

Прыехалі кіраўнікі трэсту ў Ленінград, пакруціліся дзьве гадзіны ў тэхнікуме, пагулялі па горадзе і зноў паехалі ў трэст дзяліцца ўражаньнямі.

Але не спадабаўся ім тэхнікум. Для швейнай прамысловасьці, бачыце, непатрэбны высока-кваліфікаваныя тэхнічныя кадры, а таму яны не вялі і не вядуць ніякай падрыхтоўкі рабочых у тэхнікум і нават не растлумачылі рабочым аб яго існаваньні. І толькі на фабрыцы „Кастрычнік" дырэктар напісаў абвестку, аб прыёме заяў для паступленьня ў швейтэхнікум. Але, дзякуючы чуткам, якія распаўсюдзіліся вакол тэхнікуму, ніхто з рабочых ня езьдзе туды вучыцца. У выніку—Белшвейтраст амаль зусім не выканаў разьвёрсткі. Але загадчык аддзелу кадраў трэсту супакойвае, што гэта бяда невялікая,—мы лепш організуем на Беларусі свой швейны тэхнікум.

Паўстае пытаньне: як гэта зразумець? У той час, як існуе і вядзе сваю вялікую працу тэхнікум усесаюзнага значэньня, людзі з Белшвейтрэсту манкіруюць ім, выходзячы з таго, „што швейнай прамысловасьці непатрэбны такія спэцы" і... мяркуюць організаваць свой тэхнікум. Надзвычайна характэрная беспрынцыпнасьць!

Мы лічым, што нельга ствараць новы тэхнікум, не запоўніўшы разьвёрсткі ва ўсесаюзны тэхнікум, і што трэба прыняць патрэбныя захады да тых галавацяпаў, якія так „прынцыпова" вырашаюць проблему кадраў.

Л. Шостак.

Пчалiная пасена ў комуне „Зьвязда"

(Астрашыцка-Гарадзецкі раён)

На здымку. Від на пасеку з паўночнага боку.

Па Савецкай Беларусі

(Ад нашых корэспондэнтаў)

Забіты старшыня колгасу тав. Рыжы

Працоўныя Самахвалаўшчыны патрабуюць суровага пакараньня забойцаў

САМАХВАЛАВІЧЫ, 30. (Па тэлефону ад нашага кор.) 28-га жніўня падкулачнікамі забіты старшыня колгасу „Ленінскі Шлях"—тав. Рыжы, які вярочаўся ў колгас з м. Самахвалавічы.

Прокуратурай вядзецца тэрміновае сьледзтва. Колгасьнікі і ўся акалічная бедната патрабуюць суровага пакараньня забойцаў.

КЛЯБАНАЎ.

Плешчаніцкія галавацяпы зрываюць сіласаваньне

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 30. Справа сілосаваньня па Плешчаніцкім раёне пад пагрозай зрыву.

Усяго выкапана на сёньнешні дзень каля 10 ям. Для пабудовы сілосных ям не хапае цэмэнту, а райколгассаюз не паклапоціцца завезьці ў раён патрэбную колькасьць цэмэнту.

Згодна пастановы райштабу па сіласаваньню, у раёне павінна быць пабудавана 38 ям, а райземкамісія гэтую лічбу скараціла да 28.

У апошні час райштаб па сіласаваньню працуе слаба. Патрабуем прыцягненьня да адказнасьці ўсіх вінаватых у зрыве сіласаваньня.

ГЕЛЬФМАН.

Сыгналаў не пачулі

„Чырвоная Зьмена" не раз ужо ня раз сыгналізавала аб тым, што комсамольскія організацыі павінны разгарнуць падрыхтоўку да асеньняга набору ў ФЗВ. Ня гледзячы на гэта, у большасьці мясцох нават і апошняга сыгналу „Чырвонай Зьмены" не пачулі.

Заслаўская комсамольская організацыя да пасылкі комсамольцаў у ФЗВ не прыступіла. Праўда, Азэт паслаў толькі 5 чалавек з яўрэйскай беднаты, у лік якіх папала адна комсамолка.

Больш нічога ня было прароблена райкомам да асеньняга набору. Ніякай падрыхтоўкі не праводзілі і не праводзяць.

РК не пажадаў хоць трохі раскачацца, з-за чаго набор у ФЗВ можа прайсьці нездавальняюча.

Колькі сыгналаў вам трэба?!

А. Верас.

Паведамленьні

—Магілеўскі політыка-асьветны тэхнікум паведамляе, што прыём заяў з камандыроўкамі райкому КП(б)Б на першы курс працягнуты да 15-га верасьня.

—Прыём заяў у Старасельскую ткацкую профшколу працягнуты да 10-га верасьня. Прымаюцца скончыўшыя сямігодкі. Школа рыхтуе інструктараў саматужнага ткацтва.

Адрас: м. Старое Сяло, Віцебскай акруг.

Дом Комасьветы. 30-га жніўня, а 8-й гадзіне ўвечары будзе прачытана лекцыя для партыйнага і комсамольскага актыву на тэму: — „Навейшыя дасягненьні ў хэміі". Пасьля—мастацкае аддзяленьне. Білеты па РК КП(б)Б.

— Пачатак заняткаў на 1-ым курсе рабфаку—1-га кастрычніка, на астатніх 1-га верасьня. Прыём на беларускае аддзяленьне скончаны. На яўрэйскае і польскае аддзяленьні прымаюць заявы да 5-га верасьня, пачатак іспытаў—10 верасьня.

Дзяржнат

Прыём заяў у Бабруйскі ФЗВ пры дрэваапрацоўчым комбінаце працягваецца да 5-га верасьня. Прымаюцца дзеці рабочых, колгасьнікаў, батракоў і беднякоў ва ўзросьце ад 15 да 18 гадоў з ведамі сямі групп. ФЗВ рыхтуе кваліфікаваных рабочых у наступныя цэхі: 1.—Лесапільны, 2 — Фанерны, 3.—Беладзяраўны, Сьлясарна-мэханічны і аўтавозны. Тэрмін навучаньня—2 гады. Вучні ФЗВ будуць забясьпечаны інтэрнатамі. Заявы падаваць у прыймовую камісію пры ФЗВ.

1-IX 1930 г., а 5 гад. увечары будзецца бюро Фрунз. РК ЛКСМБ. Яўка ўсіх сяброў і кандыдатаў абавязкова.

Сэкратар РК Райхельсон.

Даводзіцца да ведама ўсіх комсамольскіх ячэек Фрунзаўскага раёну, што з 31 жніўня штаб па сілосаваньню накіроўвае комсамольцаў з 7 гадзін ранку на працу па сілосаваньню прыгарадных колгасаў і саўгасаў пад адказнасьць сэкратароў ячэек.

1-IX, а 7 гадз. увечары на 4 паверсе Дзяржгандальбела адбудзецца пашыраная нарада брыгады „легкай кавалерыі" пры комсам. к-ве НКГ, на якой будзе разгледжана пытаньне аб інформацыя брыгады аб выніках абсьледаваньня Белкоопсаюзу, Белвадсаюзу і Саюзхлебу па пытаньнях аб хлебанарыхтоўках.

Запрашаюцца прадстаўнікі вышэй памянёных організацый.

БЮРО НКГ.

Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ 31-VIII а 5 з паловай гадз. увечары у памяшканьні райкому склікае нараду кіраўнікоў масавых і ваенна-фізкультурных гурткоў ячэек ЛКСМБ. Яўка ўсіх абавязкова.

Фрунзаўскі РК ЛКСМБ на 2 IX склікае а 8-й гадз. увечары у памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых абяднаная паседжаньне бюро РК і савецкі ўстаноў сумесна з бюро клюбу па пытаньнях клюбу па пытаньнях работы і падрыхтоўкі да МЮДУ ў сувязі з важнасьцю пытаньня яўка абавязкова.

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Усім ячэйкам ЛКСМБ гор. Менску

Фрунзаўскі і Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ прапануюць пад асабістую адказнасьць СЭКРАТАРОЎ ЯЧЭЕК

не пазьней 2-га верасьня гэтага году даслаць у в-ва „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА" (па тэлефону № 9-03)

наступныя весткі:

1. Колькасьць комсамольцаў і працоўнай моладзі ў ячэйцы.
2. Прозьвішча і імя ўпаўнаважанага па выданьнях „Чырвонай Зьмены".

Фрунзаўскі і Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599